Чечет В.В.

Нацыянальная камісія па правах дзіцяці
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

# СТАНОВІШЧА ДЗЯЦЕЙ
# У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ
# У 2001 ГОДЗЕ

Нацыянальны даклад

Мінск 2002

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Становішча дзяцей у Рэспубліцы Беларусь у 2001 годзе

### 1. Уводзіны

Нацыянальны даклад "Становішча дзяцей у Рэспубліцы Беларусь у 2001 годзе" адлюстроўвае асноўныя вынікі дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі ў адносінах да дзяцей па выніках 2001 года, мэтанакіраванае і паслядоўнае імкненне Рэспублікі Беларусь забяспечыць прыярытэт інтарэсаў дзяцей у сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. Ён з'яўляецца лагічным працягам Нацыянальнага даклада аб выкананні рашэнняў Сусветнай сустрэчы на вышэйшым узроўні ў інтарэсах дзяцей (1990 г.), Нацыянальных дакладаў "Становішча дзяцей у Рэспубліцы Беларусь у 1999 годзе" і "Становішча дзяцей у Рэспубліцы Беларусь у 2000 годзе". Аналітычны характар зместу даклада накіраваны на ацэнку рэальнага становішча дзяцей у краіне і яго адпаведнасці патрабаванням міжнародных дакументаў і рэкамендацый у інтарэсах дзяцей, да якіх далучылася і ўзяла на сябе абавязацельствы па выкананню Рэспубліка Беларусь.

На развіццё і ажыццяўленне дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі ў адносінах да дзяцей у 2001 г. аказала уплыў прыняцце ў кастрычніку 2000 г. у новай рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь "Аб правах дзіцяці" і правядзенне комплексу мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН аб становішчы дзяцей (2002 г.). Палітычнае значэнне мела рашэнне аб абароне дзяцінства ў дзяржавах-удзельніках Садружнасці Незалежных Дзяржаў, якое прынята Саветам Кіраўнікоў урадаў у лістападзе 2000 г. і аб'ява 2001 г. Годам дзіцяці ў краінах-удзельніках СНД. У межах Года дзіцяці Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь зацверджаны і рэалізаваны План асноўных мерапрыемстваў па правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь Года дзіцяці ў 2001 г. (№ 05/37 ад 22.02.2001 г.), што забяспечыла актывізацыю намаганняў дзяржаўных структур і грамадскіх арганізацый па рашэнню канкрэтных праблем дзяцей.

Асаблівая ўвага пры ажыццяўленні сацыяльнай палітыкі была ўдзелена развіццю дзіцячых ініцыятыў, шырокаму прыцягненню саміх дзяцей да прыняцця рашэнняў, што тычыцца іх жыццядзейнасці, абмеркавання нацыянальных дакладаў аб становішчы дзяцей. Найбольш значнай падзеяй у гэтым плане сталі Нацыянальная дзіцячая асамблея і ўдзел дзіцячай грамадскасці ў Сусветнай кампаніі "Скажы дзецям – так". Лагічным працягам, стаўшага штогадовым, нацыянальнага дзіцячага форума з'явілася Нацыянальная дзіцячая асамблея. У 2001 г. Нацыянальная дзіцячая асамблея ўключала другі Нацыянальны дзіцячы форум, які адбыўся 31 мая – 2 чэрвеня, і школу маладога лідэра ў Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым лагеры "Зубронак" з 2 па 19 чэрвеня. У Нацыянальным дзіцячым форуме прыняло ўдзел больш 250 дзяцей з усіх рэгіёнаў краіны. У складзе ўдзельнікаў – прадстаўнікі дзіцячых і

маладзёжных арганізацый, клубаў па інтарэсах, дзіцячых самадзейных ініцыятыў, органаў вучнёўскага самакіравання

Прыкметнай падзеяй з'явіўся ўздзел дзіцячай грамадскасці ў Сусветнай кампаніі "Скажы дзецям – так", мерапрыемствы якой адбываліся на працягу ўсяго года. Найбольш яркімі падзеямі ў межах акцыі прадстаўляюцца: запаўненне анкет "Скажы дзецям – так" і ўрок 1 верасня. Усяго было распаўсюджана 370 тысяч анкет і апрацавана 310 тысяч. Такім чынам, тысячы дзяцей краіны далучылі свой голас да закліку аб стварэнні лепшага свету для ўсіх дзяцей. Спецыяльны урок "Скажы дзецям – так" адбыўся 1 верасня 2001 г. на ўсіх школах Беларусі. Мерапрыемствы ў рамках Сусветнай кампаніі "Скажы дзецям – так" і Нацыянальная дзіцячая асамблея праведзены пры падтрымцы Прадстаўніцтва Дзіцячага фонда ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь.

### 2. Кантынгент дзяцей

На пачатку 2001 г. у Рэспубліцы Беларусь пражывала 9950940 чалавек (- 39495 чал. у параўнанні з 2000 г.), з іх 2251753 – дзеці ва ўзросце 0-17 гадоў уключна, што складае 22,6% ад агульнай колькасці насельніцтва краіны. З агульнай колькасці 648378 – дзеці ва ўзросце 0-6 гадоў (6,5% ад агульнай колькасці насельніцтва краіны), 1269911 – ва ўзросце 7-15 гадоў (12,7%), 333464 – ва ўзросце 16-17 гадоў (3,4%). Асобы мужчынскага полу складаюць 1154268 чал. (51,3%), жаночага 1097485 чал. (48,7%). З агульнай колькасці дзяцей ва ўзросце 0-17 гадоў 1613648 дзяцей (71,7%) пражывае ў гарадской мясцовасці, 638105 дзяцей (28,3%) – у сельскай.

Найбольшая колькасць дзяцей пражывае ў г.Мінску (360177 чал.) і Брэсцкай вобласці (357574 чал.), найменшая – у Магілёўскай (269810 чал.) і Гродзенскай (270814 чал.).

У 2001 г. не ўдалося прыпыніць зніжэнне колькасці насельніцтва. У параўнанні з 2000 г. колькасць дзяцей зменшылася на 80605 чалавек, або на 3,5% (у 2000 г. адпаведна 64724 і 4,4%). За перыяд з 1990 г. па 2002 г. агульнае зніжэнне колькасці дзяцей склала 541133 чал. Тэндэнцыя агульнага змяншэння колькасці дзяцей характэрна і для асобных узроставых катэгорый. Колькасць дзяцей ва ўзросце 0-6 гадоў зменшылася на 16483 чал. (з 6,7% у 2000 г. да 6,5%), 7-15 гадоў – на 57237 чал. (з 13,3% да 12,7%); 16-17 гадоў – на 6886 чал., аднак у працэнтных адносінах засталася на ўзроўні папярэдняга года.

У 2001 г. адбыліся змяненні ў полаўзроставым саставе дзяцей. У параўнанні з 2000 г. колькасць дзяцей мужчынскага полу зменшылася на 40622 чал. (+ 7903 да ўзроўню 2000 г.), на 39984 (чал. (+7979) – колькасць дзяцей жаночага полу.

Найбольшае змяншэнне колькасці дзяцей у 2001 г. адбылося ў Мінскай вобласці (- 13757 чал.) і г.Мінску (- 1342 чал.), найменшае зніжэнне – у Гродзенскай (- 8632 чал.) і Магілёўскай (- 9684 чал.) абласцях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ